УДК 373

# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ПРАДМЕТА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» ВА ЎМОВАХ НАВУЧАННЯ Ў КЛАСАХ СПАРТЫЎНА-ПЕДАГАГІЧНАГА ПРОФІЛЮ

**І. А. Маркевіч**
*Сярэдня школа № 10 імя Ў. М. Азіна г. Полацка,*
*г. Полацк, Рэспубліка Беларусь, Irusha3069@gmail.com*

У артыкуле раскрываецца значымасць пытання развіцця творчых здольнасцей вучняў ў класах спартыўна-педагагічнага профілю; прыводзяцца прыклады выкарыстання некаторых метадаў і прыёмаў на уроках беларускай мовы.

***Ключавыя словы:*** творчасць; метады; прыёмы; праблемна-пошукавы дыялог; сістэматычнасць у навучанні; камунікатыўныя ўменні.

# THE DEVELOPMENT OF STUDENTS CREATIVE ABILITIES BY MEANS OF BELARUSIAN LANGUAGE SUBJECT IN SPORTS AND PEDAGOGICAL GRADES

**I. A. Markevich**
*Secondary School No. 10 named after V. M. Azin of Polotsk,*
*Polotsk, Republic of Belarus, Irusha3069@gmail.com*

The article reveals the significance of the development students' creative abilities in sports-pedagogical classes; this article presents examples of using some methods and techniques in Belarusian language lessons.

***Keywords:*** creativity; methods; techniques; search-problematic dialogue; systematic learning; communication skills.

Творчасць – далёка не новы прадмет для вывучэння. Праблема фарміравання і развіцця здольнасцей даследуецца сумеснымі намаганнямі многіх навук. Вывучаецца яна featured рознабакова, таму што кожная навука мае свой адпаведны аспект даследавання. Напрыклад, з філасофскага пункту гледжання творчыя здольнасці ўключаюць у сябе здольнасць творча ўяўляць, назіраць, неардынарна думаць. А вось у псіхалогіі пад творчымі здольнасцямі разумеюцца індывідуальныя асаблівасці дзіцяці, якія не залежаць ад разумовых здольнасцей і праяўляюцца ў дзіцячай фантазіі, асобым бачанні свету. Па праблеме творчага развіцця вучняў ёсць і педагагічныя даследаванні (М. А. Лазарук, В. А. Сухамлінскі, С. І. Цыбульская). Згодна з даследаваннямі дыдактаў, навучанне творчасці школьнікаў – гэта развіццё ўмення асведамляць праблему, вызначаную настаўнікам, а пазней – фармуліраваць яе самому. Для педагогікі важна даследаванне здольнасцей кожнай асобы. Праз здольнасці асоба становіцца суб’ектам дзейнасці ў грамадстве, праз развіццё здольнасцей чалавек дасягае сваёй вяршыні ў прафесійным і асобасным сэнсе.

У сваёй рабоце будзем прытрымліваццa шматаспектнага падыходу да вызначэння творчасці. Якая разглядаецца як прадукт дзейнасці, працэс дзейнасці і асобасныя якасці дзіцяці. Акадэмік М. А. Лазарук адзначаў: «Навучанне мове і літаратуры ўключае ў сябе і працэс вывучэння, і штосьці звыш таго. Гэтае «звыш таго» – творчасць. Яна заўсёды прадугледжвае высокае напружанне і засяроджанасць, яднанне ўсіх духоўных сіл чалавека – думкі, эмоцыі, фантазіі, волі» [1]. Настаўніку застаецца толькі дапамагчы вучням актуалізаваць здольнасці, развіць іх.

Работа па развіцці творчых здольнасцей вучняў на ўроках беларускай мовы ў спартыўных класах уключае элементы гульнёвай тэхналогіі, развіваючага, праблемнага, эўрыстычнага навучання, якія спалучаюцца з рознымі метадамі і прыёмамі. Можна выкарыстоўваць і традыцыйныя формы навучання, таму што любая форма ўрока (класныя гадзіны, інтэлектуальныя гульні, інтэрактыўныя экскурсіі, інфармацыйныя гадзіны, факультатыўныя заняткі) прынясе плён, калі яна адпавядае ўзроўню класа, з'яўляецца цікавай і займальнай.

Для стварэння ў школьнікаў эмацыянальнага настрою, атмасферы ўзаемадапамогі, што дапамагае настроіць на працу, абудзіць цікавасць, можна выкарыстоўваць прыём «Афарызмы» (зачытваць выказванні вядомых людзей пра спорт, зрабіць пераклад верша пра спорт, цытаты з рускай мовы на беларускую, даць магчымасць проста паразважаць над пэўнымі словамі). Для арганізацыі паспяховага ўзаемадзеяння выкарыстоўваецца прыём «Камплімент», калі кожнаму навучэнцу неабходна сказаць штосьці прыемнае суседу па парце, улічваючы інфармацыю пра той від спорту, якім цікавіцца ці займаецца дзіця. Заданне ўскладняецца, калі трэба выкарыстоўваць словы па пэўнай тэме (напрыклад, якасныя прыметнікі). Калі ўрок праводзіцца ў групавой форме, то выкарыстоўваецца прыём «Алітэрацыя імені», каб настроіць на сумесную працу, стварыць добрую атмасферу ў класе. Парой, звяртаючыся да дзяцей, можна закончыць радкі верша, выказвання (метад «Завяршы фразу»). І маўленчыя сітуацыі, пры якіх вучні павінны ўявіць сябе ці спартыўным каментатарам, ці журналістам, ці актыўным балельшчыкам, праходзяць цікава.

На этапе засваення вучнямі новага матэрыялу, асэнсавання паняццяў, калі патрэбна актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, арганізоўваецца праблемна-пошукавы дыялог на аснове тэкстаў спартыўнай тэматыкі. Такая гутарка прыводзіць да самастойнасці думкі, аргументаванасці выказвання («Беларускія спартсмены», «Вытокі спартыўных перамог», «Я выбіраю спорт», «Мы за здаровы лад жыцця», «Нам ёсць кім ганарыцца», «Любімыя віды спорту», «Алімпіёнікі Полаччыны»).

Да правядзення фізкультхвілінак патрэбна падыходзіць таксама творча, скіроўваючы асаблівую ўвагу на асабістыя заслугі кожнага дзіцяці ў спорце. Для іх гэта важна, значыма, ганарова.

Адным з найбольш эфектыўных шляхоў у барацьбе за граматнасць з'яўляецца сістэматычнасць у навучанні. Сістэма ў практыкаваннях – гэта перш за ўсё рэгулярнасць трэніровачнай работы і паступовае яе ўскладненне. Ствараючы сістэму практыкаванняў, трэба адбіраць толькі неабходнае.

Звяртацца з вучнямі да гульні «Карэктар», разглядаючы тэмы па правапісе. Для гэтага загадзя падбіраць і размнажаць тэкст з запланаванымі памылкамі. Іх агульная колькасць павінна быць вядома ўсім вучням. Гульня заканчваецца агульным каментарыем дапушчаных памылак, фарміруе пісьменнасць, развівае ўважлівасць у працэсе пошуку памылак. Удакладніць хочацца толькі тое, што ўсе тэксты падбіраюцца на спартыўную тэматыку (“Ён узышоў на Алімп”, “Сілічы”, “Таямнічы ўсплёск вясла” і інш.). Удала падабраны тэкст дапамагае не толькі праверыць правапіс пры вывучэнні пэўнай тэмы, але ажыццявіць і міжпрадметныя сувязі, удакладніць раней засвоенае, актывізаваць увагу і мысленне вучняў. Сярод заданняў да тэкстаў, з якімі даводзілася працаваць вучням, сустракаюцца і такія (1. Здагадайцеся, пра якіх славутых спартсменаў ідзе размова, і складзіце дыялог (маналог) на тэму “Сустрэча са знакамітым спартсменам”. 2. Складзіце тэкст sms-паведамлення любімаму спартсмену).

Сачыненне застаецца асноўным відам практыкавання ў сістэме развіцця маўленчай дзейнасці школьнікаў. Таму неабходна імкнуцца, каб вучні авалодвалі асноўнымі камунікатыўнымі ўменнямі. Вучыць дзяцей, працуючы з апорнымі словамі, словазлучэннямі, звязваць іх у сказы, часткі, выкарыстоўваць для гэтага найбольш адэкватныя спосабы і сродкі сувязі. А яшчэ заўсёды памятаць пра тыя прыёмы, якія цытуе ў сваёй кнізе «Уяўленне і творчасць у дзіцячым узросце» Л. С. Выгоцкі: «Першае: прапаноўваць самы вялікі і разнастайны выбар тэм… Другое: даваць чытаць дзецям дзіцячыя сачыненні і толькі дзіцячыя сачыненні прапаноўваць за ўзоры. Трэцяе (асабліва важнае): ніколі ў час разгляду дзіцячых сачыненняў не рабіць вучням заўваг ні пра ахайнасць сшыткаў, ні пра каліграфію, ні пра арфаграфію, ні, галоўнае, пра пабудову сказаў і пра логіку…» [2, с. 42–43]. Як паказвае вопыт, неабавязкова высокі ўзровень інтэлектуальных здольнасцей дапускае добра развітыя творчыя здольнасці. Таму, калі вучні з нізкім узроўнем навучання праяўляюць творчую ініцыятыву, то гэта толькі падтрымліваю.

Працуючы над развіццём творчых здольнасцей вучняў, прыйшлі да высновы, што яго рэалізацыя мае вялікае значэнне ў сацыяльным плане, бо фарміруе і выхоўвае актыўную жыццёвую пазіцыю ў маладых людзей. Назіраецца станоўчая дынаміка развіцця вучнёўскай матывацыі, паспяховасці вучняў, рост якасці ведаў у спецыялізаваных па спорце спартыўна-педагагічных класах, выніковасць выступленняў спартсменаў нашай школы, асвядомлены выбар будучай прафесіі (трэнерскай работы), дзейнасная зацікаўленасць вучняў у галіне захавання і ўмацавання здароўя. Змяняюцца прыярытэты каштоўнасцей і ідэалаў (гонар за дасягненні Беларусі ў спорце, гонар за дасягненні палачан у спорце (з асаблівай пашанай вучні расказвалі пра Андрэя Праневіча, нашага земляка, паралімпійскага чэмпіёна), гонар за дасягненні вучняў і выпускнікоў нашай школы (прыемна ўсведамляць, што большасць навучэнцаў маюць узнагароды ці раённага маштабу, ці абласнога, ці рэспубліканскага, і нават міжнароднага).

Такім чынам, усё вышэй сказанае сведчыць пра тое, што ў рабоце ёсць станоўчыя вынікі: дзякуючы адукацыйнаму асяродку развіваецца творчы

патэнцыял дзяцей, адбываецца ўцягненне ўсіх навучэнцаў у актыўную творчую дзейнасць, прапагандуецца здаровы лад жыцця, а вучні спартыўных, прафесійных спартыўна-педагагічных класаў усё часцей атрымоўваюць прафесію настаўніка фізічнай культуры ці трэнера (такіх у нашай установе адукацыі за апошнія 6 гадоў ужо каля сарака).

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Лазарук, М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю: пед. роздумы і пошукі / М. А. Лазарук. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 200 с.
2. Выготский, Л. С. Воображение и творчество в детском возрасте: Психол. очерк: кн. для учителя / Л. С. Выготский. – 3-е изд. – М.: Просвещение, 1991. – 93 с.: ил., с. 42–43.
3. Цыбульская, С. І. Настольная кніга настаўніка беларускай мовы і літаратуры: метадычныя рэкамендацыі і нарматыўныя патрабаванні / аўт.-склад. С. І. Цыбульская. – 2-е выд., перапрац. – Мінск : Сэр-Вит, 2009. – 288 с.